# КАЛЯНДАР ЮБІЛЕЙНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ
# МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА 2025 ГОД

**Заслаўе (каля 985),** горад ў Мінскім раёне — **1040 г.** з часу ўзнікнення гарадзішча “Замэчак”

**Нясвіжскі тэатр Радзівілаў** (1740—1791), прыватны тэатр — **285 г.** з пачатку існавання

**Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў**, якая выпрабляла знакамітыя слуцкія паясы (1740—1844) — **285 г.** з пачатку дзейнасці

**Нясвіжская друкарня**, заснавана Радзівіламі (1750—1790) — **275 г.** з пачатку існавання

**Вішнеўскі металургічны завод** (в. Вішнева, Валожынскі раён, 1780—1870), на якім упершыню ў Беларусі пабудавалася доменная печ — **245 г.** з пачатку дзейнасці

**Быкоўскі Ігнацій Якса** (1750, Мінскі раён — 1819 ці 1817), пісьменнік, філосаф, перакладчык — **275 г.**

**Барысаўскі шпаланасычальны завод** (1900), адкрытае акцыянернае таварыства — **125 г.** з часу пабудовы

**Слуцкі сыраробны камбінат** (1935), адкрытае акцыянернае таварыства — **90 г.** з часу ўводу ў эксплуатацыю

**Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў** (1965), адкрытае акцыянернае таварыства — **60 г.** з пачатку дзейнасці

**“Світанак”** (1975, г. Жодзіна), адкрытае акцыянернае таварыства па вытворчасці трэкатажу — **50 г.** з часу заснавання

## Студзень

**Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў** (1965), адкрытае акцыянернае таварыства — **60 г.**

**1 — Караткевіч Міхаіл Андрэевіч** (1940, в. Кішчына Слабада, Барысаўскі раён), вучоны ў галіне электраэнергетыкі, выдатнік Беларускай энергасістэмы — **85 г.**

**1 — Герцовіч Якаў Бенцыянавіч** (1910, Бярэзінскі раён — 1976), крытык — **115 г.**

1 — **Шырын Лявон (Леанід Іванавіч)** (1930, Слуцкі раён — 1994), дзіцячы пісьменнік, крытык — **95 г.**

2 — **Дзямідчык Яўген Паўлавіч** (1925, г. Барысаў — 2010), вучоны ў галіне онкахірургіі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі, лаўрэат Міжнароднай мемарыяльнай прэміі імя доктара Нагаі, кавалер ордэна Ф. Скарыны — **100 г.**

2 — **Басецкі Іван Ігнатавіч** (1945, в. Люціна, Валожынскі раён), заслужаны юрыст Беларусі — **80 г.**

3 — **Хадыка Уладзімір Марцінавіч** (1905, Пухавіцкі раён — 1940), паэт, перакладчык — **120 г.**

4 — **Наркевіч-Ёдка Вітольд Аляксандравіч** (1835, былая в. Пукава (цяпер в. Камсамольская, Капыльскі раён) — 1898), урач-афтальмолаг, аўтар навуковых прац у галіне хваробы вачэй — **190 г.**

4 — **Багушэвіч Марыя Уладзіміраўна** (1965, в. Цапэрка, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Клецкі раён) — 1887), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Польшчы і Беларусі — **160 г.**

4 — **Дарашкевіч Яўген Адамавіч** (1935, в. Бабі Лес, Смалявіцкі раён), вучоны ў галіне парашковай металургіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

7 — **Антановіч Васіль Васілевіч** (1950, в. Дубеі, Салігорскі раён), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і паркавай скульптуры — **75 г.**

7 — **Бахараў Пётр Міхайлавіч** (1920, Лагойскі раён — 1987), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

7 — **Валожын Павел Фаміч** (1915, в. Нізок, Уздзенскі раён — ?), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай і Магілёўскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну — **110 г.**

9 — **Князеў Васіль Аляксандравіч** (1920, г. п. Бобр, Крупскі раён — 1968), ваенны дзеяч, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

10 — **Бірыч Таццяна Васільеўна** (1905, в. Лошніца (цяпер аг. Лошніца), Барысаўскі раён — 1993), вучоны ў галіне афтальмалогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі, выдатнік аховы здароўя СССР — **120 г.**

**10 — Капуцкі Фёдар Мікалаевіч** (1930, Маладзечанскі раён — 2017), вучоны-хімік, педагог, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **95 г.**

**10 — Рудовіч Эдуард Антонавіч** (1890, Мін. губ. — ?), лётчык, удзельнік Першай сусветнай вайны, кавалер ордэна Святога Георгія IV ступені, Святой Ганны IV і III ступеняў, Святога Станіслава III і II ступеняў, Святога Уладзіміра IV ступені — **135 г.**

**10 — Крукаў Іван Ігнатавіч** (1910, Чэрвенскі раён — 1994), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944) — **115 г.**

**13 — Кацько Уладзімір Аляксандравіч** (1940, в. Мяжніца, Чэрвенскі раён), вучоны ў галіне хірургіі, выдатнік аховы здароўя — **85 г.**

**14 — Дулеба Антон Мікалаевіч** (1920, Чэрвенскі раён — 1983), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага саюза — **115 г.**

**14 — Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей**, дзяржаўная ўстанова (1995) — **30 г.** з часу адкрыцця для наведвальнікаў

**16 — Бягун Аляксей Васільевіч** (1885, в. Пярэжыр, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) —1943), удзельнік рэвалюцынайга руху на Беларусі — **140 г.**

**16 — Пальчэўскі Алесь (Аляксандр Восіпавіч)** (1905, в. Прусінава, Уздзенскі раён — 1979), пісьменнік, аўтар аповесцяў, апавяданняў, перакладчык — **120 г.**

**16 — Янушка Анатоль Давыдавіч** (1930, в. Цялядавічы, Капыльскі раён — 2008), вучоны ў галіне лесаводства і эканомікі, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі — **95 г.**

**18 — Айзенштат Меер Бенецыянавіч** (1895, г. Клецк — 1961), скульптар, работы якога захоўваюцца ў Трацякоўскай галерыі — **130 г.**

**18 — Більдзюкевіч Лявон Лявонавіч** (1895, г. п. Івянец, Валожынскі раён — 1942), педагог, матэматык, грамадскі дзеяч, які ўнёс пэўны ўклад у беларускую тэрміналогію — **130 г.**

**18 — Герасімовіч Георгій Ігнатавіч** (1930, в. Новы Двор, Мінскі раён), вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **95 г.**

**19 — Ушакоў Іван Міхайлавіч** (1910, г. Барысаў — 1966), тэатральны мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **115 г.**

**20 — Бальчэўская Галіна Францаўна** (1945, в. Палессе, Мядзельскі раён — 2005), актрыса тэатра і кіно, заслужаная артыстка Беларусі — **80 г.**

**21** — **Станкевіч Юры (сапр. Харытановіч Георгій Васільевіч)** (1945, г. Барысаў — 2021), празаік, драматург, сцэнарыст — **80 г.**

**26** — **Моркаўка Аркадзь Андрэевіч** (1900, Пухавіцкі раён — 1957), паэт — **125 г.**

**27** — **Букаціна Галіна Мікалаеўна** (1960, г. Маладзечна), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі — **65 г.**

**27** — **Звярко Міхаіл Мартынавіч** (1930, г. п. Івянец, Валожынскі раён — 1989), майстар мастацкай керамікі, аўтар шэрага арыгінальных твораў, а таксама ўзораў керамічных вырабаў для масавай творчасці — **95 г.**

**28** — **Хацкевіч Аляксандр Ісакавіч** (1895, в. Навасёлкі, Барысаўскі раён — 1937), дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч Беларусі, удзельнік Першай сусветнай вайны, барацьбіт за ўстанаўленне савецкай улады на Барысаўшчыне — **130 г.**

**29** — **“Сілічы”**, рэспубліканскі гарналыжны цэнтр (Лагойскі раён; 2005) — **20 г.** з часу адкрыцця

**30** — **Бярэзінскі біясферны запаведнік**, дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова (Мін. і Віцеб. вобласці; першы дзяржаўны запаведнік у Беларусі; 1925) — **100 г.** з часу стварэння

Люты

**1** — **Марцінкевіч Фелікс Станіслававіч** (1920, в. Машчонае, Дзяржынскі раён — 1992), вучоны-эканаміст, акадэмік НАН Беларусі — **105 г.**

**2** — **Максімовіч Уладзімір Васільевіч** (1940, в. Лань, Нясвіжскі раён), вучоны ў галіне ветэрынарнай медыцыны, выдатнік адукацыі Беларусі — **85 г.**

**3** — **Латушка Міхаіл Якаўлевіч** (1945, Дзяржынскі раён), жывапісец, графік, мастак манументальна-дэкаратыўнага мастацтва — **80 г.**

**4** — **Радзівіл Мікалай (мянушка Чорны)** (1515, г. Нясвіж, Навагр. ваяв. — 1565), дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага — **510 г.**

**6** — **Мазо Рахіль Эфраімаўна** (1910, г. Барысаў — 2000), вучоны ў галіне педыятрыі і кардыялогіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984) — **115 г.**

**13** — **Радзівіл Францішка Уршуля** (1705, Украіна — 1753), пісьменніца, паэтка, першая жанчына-драматург у Вялікім Княстве Літоўскім, заснавальніца Нясвіжскага тэатра Радзівілаў — **320 г.**

**14** — **Наржымскі Уладзімір Аляксандравіч** (1915, в. Цімкавічы, Капыльскі раён — 1988), ваенны летчык, вучоны ў галіне ваенных навук, педагог, Герой Савецкага Саюза — **110 г.**

**15 — Сахута Яўген Міхайлавіч** (1945, в. Вечатарова, Стаўбцоўскі раён), вучоны ў галіне мастацтвазнаўства і этналогіі, даследчык тэорыі, гісторыі і сучаснага стану беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйных мастацкіх рамёстваў і промыслаў, аўтар шматлікіх манаграфій, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" — **80 г.**

**16 — Крук Аркадзь Сцяпанавіч** (1920, в. Яснаўка, Пухавіцкі раён — 2015), вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **105 г.**

**17 — Вішнеўскі Уладзімір Мікалаевіч** (1955, в. Балотчыцы, Слуцкі раён), мастак, які працуе ў жывапісе, скульптуры, станковай і кніжнай графіцы, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — **70 г.**

**20 — Бондар Таіса Мікалаеўна** (1945, г. п. Рудзенск, Пухавіцкі раён — 2005), пісьменніца, перакладчыца, грамадскі дзеяч, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" — **80 г.**

**22 — Коршак Аляксей Ігнатавіч** (1920, в. Вуглы, Капыльскі раён — 1945), паэт — **105 г.**

**26 — Здановіч Аляксандр** (1805, в. Белькавічы, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) — 1868), вучоны-гісторык, пісьменнік, педагог, член Віленскай Археаграфічнай камісіі — **220 г.**

Сакавік

**1 — Вялікі Зіновій Сямёнавіч** (1900, Дзяржынскі раён — 1983), акцёр, рэжысёр — **125 г.**

**3 — Шчэрба Леў Уладзіміравіч** (1880, г. Чэрвень — 1944), расійскі мовазнавец, заснавальнік пецярбургскай філалагічнай школы, акадэмік АН СССР і АПН Расіі — **145 г.**

**3 — Козіч Іван Сямёнавіч** (1920, Уздзенскі раён — 2000), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943) — **105 г.**

**7 — Зубра Аляксей Сцяпанавіч** (1935, в. Серпутава, Барысаўскі раён), вучоны-культуролаг, педагог, аўтар падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы — **90 г.**

**13 — Шот Аляксандр Уладзіміравіч** (1925, в. Дзямідавічы, Дзяржынскі раён), вучоны ў галіне хірургіі, педагог, заслужаны дзеяч навукі Беларусі,

лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, выдатнік аховы здароўя, кавалер ордэна Пашаны — **100 г.**

**14 — Валадзько Іван Іосіфавіч** (1895, в. Плябанцы, Мін. пав. (цяпер Мінскі раён) — 1984), архітэктар, аўтар шэрагу праектаў у Мінску, Маскве і інш. гарадах — **130 г.**

**15 — Шыкунова Ірына Сямёнаўна** (1940, в. Камуна, Любанскі раён — 2020), артыстка оперы (лірычнае сапрана), педагог, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, узнагароджана медалём Ф. Скарыны — **85 г.**

**17 — Ермаловіч Валянцін Іванавіч** (1925, в. Малыя Навасёлкі, Дзяржынскі раён — 2004), рэжысёр, акцёр, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — **100 г.**

**18 — Грывусевіч Пётр Браніслававіч** (1935, в. Петраградзь, Мядзельскі раён), жывапісец, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу — **90 г.**

**22 — Кухарчык Пётр Дзмітрыевіч** (1945, в. Арда, Клецкі раён — 2014), вучоныў галіне оптаэлектронікі і радыёфізікі, педагог, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны работнік адукацыі Беларусі — **80 г.**

**23 — Бурак Леанід Іванавіч** (1930, Вілейскі раён — 1996), мовазнаўца, заслужаны работнік адукацыі Беларусі — **95 г.**

**23 — Стары Улас (сапр. Сівы-Сівіцкі Уладзіслаў)** (1865, г. Валожын — 1839), паэт, фальклярыст, які займаўся апрацоўкай народных паданняў і легенд — **160 г.**

**23 — Сташэўскі Васіль Пятровіч** (1895, в. Свінка, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер в. Лугавая Капыльскі раён) — 1937), празаік, драматург, грамадскі дзеяч — **130 г.**

**25 — Вечар Аляксандр Сцяпанавіч** (1905, в. Машчыцы, Слуцкі раён — 1985), вучоны ў галіне біяхіміі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, паэт, кавалер ордэна Дружбы народаў — **120 г.**

**25 — Папковіч Уладзімір Антонавіч** (1935, в. Дварэц, Вілейскі раён — 2021), паэт, празаік, перакладчык, педагог, аўтар вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай школы — **90 г.**

**26 — Шніп Віктар Анатольевіч** (1960, в. Пугачы, Валожынскі раён), паэт, лаўрэат прэміі імя У. Маякоўскага, літаратурнай прэміі “Залаты Купідон” і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — **65 г.**

**28** — **Паўтовіч Яўген Мікалаевіч** (1940, г. п. Рудзенск, Пухавіцкі раён — 2010), артыст балета, рэжысёр-пастаноўшчык, педагог, заслужаны артыст Беларусі — **85 г.**

**29** — **Міронччык Уладзімір Юстынавіч** (1915, в. Ячава, Слуцкі раён — 1990), медык-хірург, заслужаны урач Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы — **110 г.**

**31** — **Рабчук Сяргей Ануфрыевіч** (1940, ст. Негарэлае, Дзяржынскі раён), трэнер (веласіпедны спорт), заслужаны трэнер Беларусі, сярод выхаванцаў якога бронзавы прызёр чэмпіянату свету Л. Гаражанская, бронзавы прызёр XXVIII Алімпійскіх гульняў, чэмпіён свету Н. Цылінская — **85 г.**

Красавік

**1** — **Басалыга Уладзімір Самойлавіч** (1940, г. Слуцк — 2020), графік, які працаваў у галіне кніжнай і станковай графікі, экслібрыса і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дыпламант конкурсаў мастацтва кнігі — **85 г.**

**4** — **Карзюк Віктар Іванавіч** (1945, в. Петрашунцы, Валожынскі раён), вучоны-матэматык, педагог, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **80 г.**

**6** — **Купалаўскі ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння** (Мінскі і Лагойскі раёны, 2000 г.) — **25 г.**

**10** — **Баркоўскі Сцяпан Андрэевіч** (1905, г. Слуцк — 1966), этнограф, літаратурны крытык, літаратуразнаўца — **120 г.**

**14** — **Вронскі Макар Кандратавіч** (1910, г. Барысаў — 1994), украінскі скульптар, народны мастак Украіны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Украіны імя Т. Р. Шаўчэнкі — **115 г.**

**14** — **Дыла Язэп (Восіп Лявонавіч)** (18802, г. Слуцк — 1973), пісьменнік, тэатразнаўца, грамадскі дзеяч, правадзейны член Інбелкульта — **145 г.**

**15** — **Пілатовіч Валерый Станіслававіч** (1945, г. Чэрвень), вучоны ў галіне нефралогіі — **80 г.**

**16** — **Чэпік Мікалай Пятровіч** (1960, Пухавіцкі раён — 1980), удзельнік вайны ў Афганістане, Герой Савецкага Саюза — **65 г.**

**18** — **Камінскі Уладзімір Уладзіміравіч** (1950, Мінскі раён), спарстмен і трэнер (веласпорт), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXI Алімпійскіх гульняў (Манрэаль, 1976), чэмпіён (1977) і сярэбраны прызёр

(1974, 1975, 1976) чэмпіянатаў свету, чэмпіён СССР (1976, 1977, 1978, 1980), кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **75 г.**

**20 — Абалмасаў Аляксей Аляксандравіч** (1980, г. Барысаў), спартсмен (веславанне на байдарках), заслужаны майстар спорту Беларусі, майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, алімпійскі чэмпіён, чэмпіён Еўропы і свету — **45 г.**

**20 — Лятун Уладзімір Міхайлавіч** (1935, в. Смалінец, Уздзенскі раён — 2001), скульптар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — **90 г.**

**20 — Мархель Уладзімір Іосіфавіч** (1940, в. Жыгалкі, Стаўбцоўскі раён — 2013), літаратуразнаўца, даследчык беларускай літаратуры XIX ст., беларуска-польскіх літаратурных сувязяў, паэт, перакладчык — **85 г.**

**22 — Мехавіч Уладзімір Уладзіміравіч** (1955, Вілейскі раён), мастак, аўтар прац у станковай і кніжнай графіцы — **70 г.**

**23 — Свідзерскі Савелій Аляксеевіч** (1905, в. Дзяньгубка, Крупскі раён — 1977), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

Май

**1 — Лапцёнак Сяргей Данілавіч** (1935, в. Васільеўка, Бярэзінскі раён — 2012), вучоны-філосаф, сацыёлаг, пісьменнік, заснавальнік навуковай школы па этыцы і сямейнай сацыялогіі — **90 г.**

**1 — Сафія Слуцкая (дзявочае Алелькавіч, па мужу Радзівіл)** (1585, г. Слуцк — 1612), рэлігійная дзеячка, асветніца, святая Беларускай Праваслаўнай Царквы, апошняя з княжацкага роду Алелькавічаў — **440 г.**

**1 — Ціхаў Гаўрыіл Андрыянавіч** (1875, г. Смалявічы — 1960), расійскі астраном і астрафізік, заснавальнік астрабатанікі і адной з першых хатніх абсерваторый, ганаровы акадэмік НАН Беларусі, акадэмік АН Казахстана, член-карэспандэнт АН СССР, заслужаны дзеяч навукі Казахстана, лаўрэат прэміі Парыжскай АН, кавалер ордэна Леніна — **150 г.**

**3 — Бялявін Евель Самуілавіч** (1920, г. Барысаў — 1972), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**3 — Грушоў Вячаслаў Георгіевіч** (1950, г. Лагойск), акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі — **75 г.**

**3 — Лавінскі Хрытафор Хрыстафоравіч** (1940, г. Нясвіж — 2018), вучоны ў галіне гігіены, выдатнік аховы здароўя Беларусі і СССР — **85 г.**

**6 — Гаўрук Юрка (Юрый Паўлавіч)** (1905, г. Слуцк — 1979), перакладчык, паэт, крытык, аўтар першай у Беларусі кнігі паэтычных перакладаў “Кветкі з чужых палёў” — **120 г.**

**6 — Мясніковіч Міхаіл Уладзіміравіч** (1950, в. Новы Сноў, Нясвіжскі раён), дзяржаўны і грамадскі дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст, член-карэспандэнт НАН Беларусі, кавалер ордэна “Знак Пашаны”, ордэнаў Айчыны III ступені, Дружбы (Расійскай Федэрацыі), Дружбы (Кітайскай Народнай Рэспублікі), ордэна Свяціцеля Кірылы Тураўскага I ступені Беларускай Праваслаўнай Царквы — **75 г.**

**9 — Цэдрык Міхаіл Сямёнавіч** (1930, Бярэзінскі раён — 1994), вучоны-фізік, педагог, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі — **95 г.**

**12 — Ванькові Валенцій Мельхіёравіч** (1800, Бярэзінскі раён — 1842), жывапісец, прадстаўнік рамантызму, які пакінуў след не толькі ў культуры Беларусі, але атрымаў вядомасць далёка за яе межамі — **225 г.**

**13 — Паўлюкоўскі Уладзіслаў** (1895, в. Ініца, Навагр. пав., Мін. губ. (цяпер Стаўбскоўскі раён) — 1955), пісьменнік, перакладчык, этнолаг, фалькларыст, мастак — **130 г.**

**14 — Старобінец Рыгор Лазаравіч** (1910, г. Беразіно — 2001), вучоны-хімік, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **115 г.**

**15 — Вайнруб Мацей Рыгоравіч** (1910, г. Барысаў — 2001), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-лейтэнант танкавых войск, Герой Савецкага Саюза — **115 г.**

**15 — “Электрамодуль”**, адкрытае акцыянернае таварыства ў складзе холдынга “Інтэграл”, спецыялізаванае прадпрыемства электратэхнічнай прамысловасці, адзіны ў Беларусі вытворца сілавой пераўтваральнай тэхнікі (г. Маладзечна, 1970 г.) — **55 г.** з часу пабудовы першай чаргі завода

**18 — Каўрус Алесь Аляксандравіч** (1935, в. Брусы, Мядзельскі раён — 2022), мовазнаўца, даследчык мовы мастацкай літаратуры і сродкаў масавай інфармацыі, беларускай тэрміналогіі, культуры мовы, аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы — **90 г.**

**20 — Вяршынін Мікола (Мікалай Пятровіч)** (1940, г. Чэрвень — 2009), паэт-сатырык, гумарыст — **85 г.**

**21 — Кавячынскі Мацей** (1520—1572), кнігавыдавец, адзін з заснавальнікаў Нясвіжскай друкарні, перакладчык, рэфармацыйны дзеяч — **505 г.**

**22 — Каспяровіч Мікалай Іванавіч** (1900, в. Ізабалёва, Ігум. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) — 1937), краязнаўца, лекскограф, мастацтвазнаўца,

літаратуразнаўца, этнограф, укладальнік першага беларускага дапаможніка па тэорыі літаратуры “Узоры для літаратурных гурткоў пры “Маладняку” і гурткоў селькораў” — **125 г.**

**24** — **Бархаткова Алена Мікалаеўна** (1965, г. Слуцк), мастак, які працуе пераважна ў жанрах пейзажа і нацюрморта — **60 г.**

**26** — **Рубацкая Ганна Міхайлаўна** (1900, в. Жураўцы, Валожынскі раён — 1993), народная песенніца, паэтэса — **125 г.**

**26** — **Крупскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей**, дзяржаўная ўстанова культуры (1995) — **30 г.** з часу заснавання

**26** — **Сяfour**

**27** — **Жылка Уладзімір Адамавіч** (1900, в. Макашы, Нясвіжскі раён — 1933), паэт — **125 г.**

**27** — **Трусаў Антон Данілавіч** (1835, г. Барысаў, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер Барысаўскі раён) — 1886), рэвалюцыянер-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі, дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху, выдавец — **190 г.**

**28** — **Аркуш Алесь (сапр. Козік Аляксандр Барысавіч)** (1960, г. Жодзіна), пісьменнік, крытык, выдавец — **65 г.**

**30** — **Трус Анатоль Міхайлавіч** (1910, в. Нізок, Уздзенскі раён — 1989), акцёр, народны артыст Беларусі — **115 г.**

Чэрвень

**2** — **Бельскі Іван Уладзіміравіч** (1945, Стаўбцоўскі раён), спартсмен, трэнер (сілавыя віды спорту), вучоны ў галіне спартыўнай педагогікі, заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Беларусі — **80 г.**

**3** — **Зуёнак Васіль Васільевіч** (1935, в. Мачулішча, Крупскі раён), паэт, празаік, перакладчык, крытык, літаратуразнаўца, ганаровы член НАН Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы — **90 г.**

**3** — **Салігорскі эканамічны каледж**, прыватная ўстанова адукацыі (2005) — **20 г.** з часу заснавання

**4** — **Гурскі Мікалай Іванавіч** (1905, в. Лугавая, Капыльскі раён — 1972), мовазнаўца, даследчык пытанняў беларускага, рускага і славянскага

мовазнаўства, педагог, аўтар і сааўтар падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для сярэдняй і старэйшай школы — **120 г.**

**4 — Бітно Леанід Рыгоравіч** (1945, г. Заслаўе), вучоны ў галіне эксперыментальнай анкалогіі, педагог, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) — **80 г.**

**5 — “Крыніца”**, вадасховішча (Мінскі раён, 1975) — **50 г.** з часу стварэння

**6 — Антановіч Антон Канстанцінавіч** (1910, в. Казлы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Нясвіжскі раён) — 1980), мовазнаўца-славіст, даследчык помнікаў татара-мусульманскага пісьменства на беларускай мове — **115 г.**

**6 — Гайсёнак Віктар Анатольевіч** (1950, в. Гасцілавічы, Лагойскі раён), вучоны-фізік, дзяржаўны дзеяч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994), выдатнік адукацыі Беларусі, выдатнік вышэйшай школы СССР — **75 г.**

**10 — Хадановіч Ігар Піліпавіч** (1940, в. Шпількі, Дзяржынскі раён — 1966), пісьменнік, аўтар апавяданняў, нарысаў — **85 г.**

**12 — Родзевіч Леапольд Іванавіч** (1895, фальв. Кур’янаўшчына, Вілейскі пав., Вілейская губ. (цяпер Лагойскі раён) — 1938), пісьменнік, драматург, публіцыст, палітычны і грамадскі дзеяч, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі — **130 г.**

**15 — Варановіч Адольф Усцінавіч** (1940, в. Мікольцы, Мядзельскі раён — 2001), пісьменнік — **85 г.**

**21 — Залескі Браніслаў Францавіч** (1820, мяст. Вызна, Слуцкі пав., Грод. губ. (цяпер г. п. Чырвоная Слабада, Салігоркі раён) — 1880), беларускі і польскі пісьменнік-дакументаліст, мастак, вучоны, член-карэспандэнт Кракаўскай АН, грамадскі дзеяч у эміграцыі (Германія, Італія, Францыя) — **205 г.**

**23 — Дудка Тамара Мікалаеўна** (1945, г. Вілейка — 1999), дзяржаўны дзеяч, ініцыятар стварэння і першы кіраўнік ГА “Беларускі саюз жанчын”, узнагароджаная ордэнам Дружбы народаў — **80 г.**

**24 — Чорны Кузьма (сапр. Раманоўскі Мікалай Карлавіч)** (1900, маёнтак Боркі на Случчыне — 1944), пісьменнік, перакладчык, імем якога названы вуліцы ў Мінску, Нясвіжы, Бабруйску, Слуцку — **125 г.**

**26 — Лобач Марына Вікенцьеўна** (1970, г. Смалявічы), спартсменка і трэнер (гімнастыка мастацкая), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка XXIV летніх Алімпійскіх гульняў (1988, Сеул), чэмпіёнка (1987), сярэбраны (1985) і бронзавы (1987) прызёр чэмпіянатаў свету, чэмпіёнка (1988) і бронзавы

прызёр (1986, 1988) чэмпіянатаў Еўропы, чэмпіёнка СССР (1985, 1987, 1988), узнагароджаная ордэнам Дружбы народаў — **55 г.**

**27 — Арабей Лідзія Львоўна** (1925, в. Нізок, Уздзенскі раён — 2015), празаік, крытык, літаратуразнаўца, аўтар зборнікаў аповесцяў і апавяданняў, у т. л. для дзяцей — **100 г.**

**27 — Кучар Алесь (сапр. Айзік Авелевіч)** (1910, в. Прудзішча, Смалявіцкі раён — 1996), крытык, публіцыст, драматург, сцэнарыст, педагог — **115 г.**

**30 — "Лінія Сталіна"**, гісторыка-культурны комплекс (Мінскі раён, 2005) — **20 г.** з часу адкрыцця.

Ліпень

**1 — Мінскі абласны тэатр лялек "Батлейка"**, дзяржаўная ўстанова, лаўрэат і дыпламант рэспубліканскіх і міжнародных тэатральных фестываляў (г. Маладзечна; 1990 г., адкрыты 27 снежня 1990 г.) — **35 г.** з часу стварэння

**2 — Лявіцкі Іван Адамавіч** (1945, Мядзельскі раён), вучоны ў галіне тэхналогіі сілікатаў, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік адукацыі — **80 г.**

**3 — Леановіч Іван Сямёнавіч** (1920, Дзяржынскі раён — 1946), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944) — **105 г.**

**4 — Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж**, дзяржаўная ўстанова адукацыі (1960) — **65 г.** з часу прыняцця рашэння аб стварэнні

**6 — Глебка Пятро (Пётр Фёдаравіч)** (1905, в. Вялікая Уса, Уздзенскі раён — 1969), паэт, перакладчык, вучоны-лінгвіст, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, кавалер одэнаў Леніна, "Знак Пашаны" — **120 г.**

**6 — Лупіновіч Іван Сцяпанавіч** (1900, в. Шацк, Пухавіцкі раён — 1968), вучоны ў галіне глебазнаўства і аграхіміі, акадэмік НАН Беларусі і Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, кавалер ордэнаў "Леніна", "Знак Пашаны" — **125 г.**

**24 — Ярашэвіч Міканор Казіміравіч** (1885, Стаўбцоўскі раён — пасля 1937), вучоны-аграном, педагог, ініцыятар адкрыцця і першы рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — **140 г.**

**28 — Дубовік Мікола** (1905, в. Каменка, Капыльскі раён — 1928), паэт, вершы якога адрозніваюцца аптымізмам, бадзёрасцю паэтычнага тону, захопленнасцю рэвалюцыйным будаўніцтвам — **120 г.**

**28 — Тумаш Генадзь (сапр. Тумас Яўген Змітравіч)** (1940, в. Кукшавічы, Дзяржынскі раён), паэт, празаік, перакладчык — **85 г.**

Жнівень

**1 — Бандарчык Васіль Кірылавіч** (1920, в. Кірава, Слуцкі раён — 2009), вучоны-этнограф, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі НАН Беларусі — **105 г.**

**1 — Хацкевіч Сцяпан Фёдаравіч** (1910, Пухавіцкі раён — 1979), акцёр, заслужаны артыст Беларусі — **115 г.**

**1 — Гурко Сяргей Пятровіч** (1940, Нясвіжскі раён), вучоны-эканаміст, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі, кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **85 г.**

**4 — Купалаўскі мемарыяльны запаведнік “Вязынка”**, філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (1945) — **80 г.** з часу заснавання

**6 — Міран Казімір Феліксавіч** (1895, Стаўбцоўскі раён — 1972), вучоны ў галіне лесаводства, заслужаны лесавод Беларусі — **130 г.**

**7 — Ермаловіч Якуб (Якаў Сідаравіч)** (1910, в. Вяшэўка, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Бярэзінскі раён) — 1987), пісьменнік, аўтар празаічных твораў на тэмы вайны, працы калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі — **115 г.**

**10 — Левін Філіп** (1900, г. Клецк — 1987), амерыканскі вучоны-імунолаг і бактэрыёлаг, адзін з заснавальнікаў імунагематалогіі, член Нацыянальнай Акадэміі навук ЗША і Нью-Ёркскай АН — **125 г.**

**10 — Ржавускі Адам Станіслававіч** (1760, г. Нясвіж — 1825), дзяржаўны дзеяч, дыпламат, паэт — **265 г.**

**11 — Карнюшка Валерый Анатольевіч** (1945, г. Барысаў — 1996), ваенны дзеяч, віцэ-адмірал — **80 г.**

**12 — Галубовіч Леанід Міхайлавіч** (1950, Клецкі раён), паэт — **75 г.**

**14 — Міхальчук Сяргей Апанасавіч** (1925, в. Скабін, Капыльскі раён — 1995), пісьменнік, перакладчык, заслужаны работнік культуры Беларусі — **100 г.**

**14 — Пратасеня Віктар Сазонтавіч (Сазонавіч)** (1925, в. Пагост, Салігорскі раён — 2001), жывапісец, які працаваў пераважна ў жанры партрэта, а таксама пейзажа, тэматычнай карціны, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **100 г.**

**19 — Гарбачова Людміла Васільеўна** (1955, в. Хадасы, Вілейскі раён), спецыяліст у галіне бібліятэчнай справы, складальнік і рэдактар

інфармацыйна-аналітычнага зборніка “Актуальные проблемы культуры и искусства”, кіраўнік і ўдзельнік рэалізацыі мультымедыйных праектаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, узнагароджана ганаровымі граматамі Беларускага фонду культуры, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, медалём Ф. Скарыны — **70 г.**

**24 — Мардвілка Аркадзь Пятровіч** (1905, в. Языль, Старадарожскі раён — 1986), пісьменнік, перакладчык, крытык — **120 г.**

**26 — Арцімовіч Анатоль Яфімавіч** (1940, в. Куранец, Вілейскі раён), скульптар, адзін са стваральнікаў Кургана Славы і мемарыяльнага комплексу Брэсцкай крэпасці-героя (цэнтральны ўваход), аўтар шэрага помнікаў гістарычным асобам, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **85 г.**

**26 — Камароўскі Яўген Міхайлавіч** (1930, Стаўбцоўскі раён), мовазнавец — **95 г.**

**27 — Каржанеўская Галіна Анатольеўна** (1950, в. Лясішча, Слуцкі раён), пісьменніца, драматург, крытык, аўтар чытанак для вучняў пачатковых класаў — **75 г.**

**27 — Чапскі Карл (Караль Ян Аляксандр) Эмерыкавіч** (1860, Дзяржынскі раён — ?), дзяржаўны дзеяч, гарадскі галава ў Мінску, намаганнямі якога ў горадзе адкрыты трамвай-конка, электрастанцыя, тэлефонная станцыя агульнага карыстання, праводзілася добраўпарадкаванне горада — **165 г.**

**29 — Манумент у гонар маці-патрыёткі**, мемарыяльны комплекс, прысвечаны беларускай жанчыне-маці, патрыётцы Н. Купрыянавай, усе пяцёра сыноў якой аддалі жыццё за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны (г. Жодзіна, 1975 г.) — **45 г.**

Верасень

**1 — Баранавых (сапр. Баранаў) Сымон Якаўлевіч** (1900, былая в. Рудкова, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Уздзенскі раён) — 1942), пісьменнік, сябра літаратурнага аб’яднання “Маладняк” і Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў — **125 г.**

**1 — Рэпін Барыс Фёдаравіч** (1940, п. Пухавічы), сцэнограф, жывапісец, графік — **85 г.**

**3 — Сініца Тамара Паўлаўна** (1940, г. Барысаў), майстар мастацкага ткацтва, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980) — **85 г.**

**3 — Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава**, дзяржаўная ўстанова, самая буйная даследчая медыцынская ўстанова Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне” (аг. Лясны, Мінскі раён, 1960) — **65 г.** з часу стварэння

**6 — Казлоўскі Віктар Іванавіч** (1905, в. Мрочкі, Уздзенскі раён — 1975), паэт, аўтар зборнікаў паэзіі, перакладаў паасобных твораў М. Святлова, М. Ісакоўскага, М. Асеева, У. Уткіна і інш. — **120 г.**

**7 — Астапчык Станіслаў Аляксандравіч** (1935, г. Мар’іна Горка — 2015), вучоны ў галіне матэрыялазнаўства і машынабудавання, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы, кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **90 г.**

**10 — Канашэвіч Вераніка Аляксандраўна** (1985, г. Барысаў), мастак, дызайнер адзення, лаўрэат шэрагу міжнародных конкурсаў — **40 г.**

**10 — Рацько Анатоль Іванавіч** (1950, Салігорскі раён — 2011), вучоны ў галіне калоіднай хіміі, член-карэспандэнт НАН Беларусі — **75 г.**

**12 — Семашкевіч Рыгор Міхайлавіч** (1945, в. Дамашы, Маладзечанскі раён — 1982), пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык — **80 г.**

**13 — Гурыновіч Хведар Хведаравіч** (1950, Салігорскі раён), паэт, у творчым багажы якога кнігі для дарослага і дзіцячага чытача, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра — **75 г.**

**15 — Ашэйчык Мікалай Захаравіч** (1940, в. Вугалец, Пухавіцкі раён), будаўнік, дзяржаўны дзеяч, заслужаны будаўнік Беларусі, заслужаны работнік юстыцыі Беларусі, выдатнік аховы здароўя Беларусі, кавалер ордэна Пашаны, Айчыны II і III ступеняў, уладальнік знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”, ганаровы грамадзянін Салігорска і Мінскай вобласці — **85 г.**

**15 — Мартысюк Пётр Рыгоравіч** (1915, в. Арэхаўка, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Чэрвеньскі раён) — 1994), удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ганаровы грамадзянін г. Барысаў — **110 г.**

**16 — Васілевіч Язэп (Іосіф Васільевіч)** (1870, Мядзельскі раён — 1934), дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, археолаг, педагог — **155 г.**

**19 — Туміловіч Янка (Іван Людвігавіч)** (1905, в. Сяліба, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Бярэзінскі раён — 1938), паэт, член літаратурных аб’яднанняў “Маладняк” і “Прабліск” — **120 г.**

**20 — Зялёнкін Міхаіл Міхайлавіч** (16 ці 20.09.1920, г. п. Рудзенск, Пухавіцкі раён — 1991), мастак-афарміцель, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**22 — Мазур Ігнат** (1890, в. Піратокі, Мін. пав. (цяпер Стаўбцоўскі раён) — 1958), дзяржаўны і грамадскі дзеяч, дзяржаўны дзеяч, які стаяў ля вытокаў зараджэння беларускай дзяржаўнасці ў 1918—1918 гг., журналіст, педагог, адзін з аўтараў хрэстаматый для школ "Чырвоная змена" і "Чырвоная Беларусь", удзельнік Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў — **135 г.**

**25 — Лявіцкая (па мужу Лёсік) Ванда Антонаўна** (1895, г. Радашковічы, Вілейскі пав., Вілен. губ. (цяпер г. п. Радашковічы, Маладзечанскі раён) — 1969), пісьменніца, дачка Ядвігіна Ш., жонка Язэпа Лёсіка, аўтарка ўспамінаў пра бацьку — **130 г.**

**28 — Дайліда Віктар Браніслававіч** (1930, в. Славінск, Слуцкі раён — 2006), пісьменнік, выдатнік народнай асветы Беларусі — **95 г.**

**28 — Гурын Антон Іосіфавіч** (1910, Дзяржынскі раён — 1962), ваенны дзеяч, контр-адмірал, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945), узнагароджаны двума ордэнамі Леніна — **115 г.**

**29 — Ходзька Ігнат** (1795, в. Заблошчына, Вілейскі пав., Вілен. ваяв. (цяпер Вілейскі раён) — 1861), пісьменнік, мемуарыст, грамадскі дзеяч — **230 г.**

Кастрычнік

**1 — Няхай Міхаіл Васільевіч** (1935, в. Галаўныя Ляды, Бярэзінскі раён), літаратуразнаўца, пісьменнік, аўтар прац па гісторыі беларускай літаратуры, беларускім літаратурныі краязнаўстве — **90 г.**

**1 — Семашкевіч Раман Мацвеевіч** (1900, мяст. Лебедзева, Маладзеч. пав., Вілен. губ. (цяпер Маладзечанскі раён) — 1937), жывапісец, графік, скульптар, творы якога набывала Траццякоўская галерэя, Рускі музей, прыватныя калекцыянеры — **125 г.**

**2 — Абравец Святлана Мітрафанаўна** (1945, г. Слуцк), вучоны-геолаг, лаўрэат прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга (2004) — **80 г.**

**8 — Шарапа Эдуард Мікалаевіч** (1940, Мінскі раён), трэнер (веласпорт), заслужаны трэнер Беларусі, сярод выхаванцаў якога — чэмпіён свету і СССР І. Сумнікаў, мнагакратныя чэмпіёны СССР К. Кузняцова, П. Кутас, А. Кісляк, А. Міклашэвіч і інш. — **85 г.**

**8 — Якімаў Пётр Іванавіч** (1915, г. Крупкі — 2008), педагог, заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі — **110 г.**

**10 — Інстытут агародніцтва, рэспубліканскае навукова-вытворчае даччынае ўнітарнае прадпрыемства** (пас. Самахвалавічы, Мінскі раён; 1925) — **100 г.**

**10 — Інстытут пладаводства, рэспубліканскае навукова-вытворчае даччынае ўнітарнае прадпрыемтсва** (пас. Самахвалавічы, Мінскі раён; 1925) — **100 г.**

**12 — Конанава Галіна Мікалаеўна** (1955, р. п. Зялёны Бор, Смалявіцкі раён), жывапісец, аўтар тэматычных карцін, партрэтаў, нацюрмортаў — **70 г.**

**25 — Дударэнка Леанід Аляксандравіч** (1930, г. Маладзечна), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000), кавалер ордэна Ф. Скарыны — **95 г.**

**25 — Паўлаў Уладзімір Андрэевіч** (1935, в. Замошша, Любанскі раён), пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа — **90 г.**

**27 — Клейнбарт Леў Максімавіч** (1875, мяст. Капыль, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер г. Капыль) — 1950), рускі крытык, публіцыст, даследчык творчасці А. Александровіча, А. Бабарэкі, Ц. Гартнага, А. Гурло, А. Дудара, Я. Пушчы, М. Чарота і інш., першы біёграф Я. Купалы і адзін з першых даследчыкаў яго творчасці — **150 г.**

**28 — Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі**, дзяржаўная ўстанова адукацыі, адна са старэйшых ўстаноў сістэмы павышэння кваліфікацыі кадраў у Беларусі (1940) — **85 г.**

**29 — Казак Мікалай Станіслававіч** (1945, Уздзенскі раён), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1978), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000), кавалер ордэнаў Пашаны і Ф. Скарыны — **80 г.**

Лістапад

**1 — Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч** (1895, Дзяржынскі раён — 1937), акцёр тэатра і кіно, адзін з заснавальнікаў беларускага тэатра, заслужаны артыст Беларусі — **130 г.**

**1 — Кавыль Міхась (сапр. Лешчанка Язэп Казіміравіч)** (1915, в. Пакрашава, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) — 2017), паэт, крытык, празаік, дзеяч беларускага замежжа — **105 г.**

**1** — **“Мінская праўда”,** грамадска-палітычная газета Мінскай вобласці, лаўрэат першага Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі ў намінацыі “Лепшая абласная газета” (2005), уладальнік знака “Залатая Літара” (1950) — 75 г.

**3** — **Бонч-Асмолаўскі Глеб Анатольевіч** (1890, Пухавіцкі раён — 1943), вучоны ў галіне антрапалогіі і археалогіі, які першым выявіў рэшткі выкапневага чалавека-неандэртальца на тэрыторыі СССР — **135 г.**

**6** — **Ходзька Леанард** (1800, Маладзечанскі раён — 1871), выдавец, гісторык, публіцыст, бібліёграф — **225 г.**

**9** — **Кавалёнак Міхаіл Іванавіч** (1900, Бярэзінскі раён — 1958), вучоны-медык, заслужаны ўрач Беларусі — **125 г.**

**11** — **Чабярук Алена Іванаўна** (1925, Барысаўскі раён — 2007), мовазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971) і Беларусі (2000) — **100 г.**

**11** — **Радзівіл Марцін Мікалай Караль** (1705, мяст. Цімкавічы, Навагарод. ваяв. (цяпер Капыльскі раён) — 1782), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага — **320 г.**

**14** — **Чарнушэвіч Нічыпар Тодаравіч** (1900, г. Капыль — 1967), паэт, перакладчык на беларускую мову твораў рускіх, украінскіх, яўрэйскіх паэтаў — **125 г.**

**16** — **Белавусаў Алег Паўлавіч** (1945, г. Слуцк — 2009), мастацтвазнавец, дзеяч кінамастацтва, сцэнарыст, рэжысёр, заснавальнік і мастацкі кіраўнік майстэрні мультфільмаў кінастудыі “Беларусьфільм” (1975—1989), анімацыйных студый (1989—1995) — **80 г.**

**16** — **Скрыган Ян (Іван Аляксеевіч)** (1905, Капыльскі раён — 1992), пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) — **120 г.**

**17** — **Ясючэня Уладзімір Мікалаевіч** (1925, в. Станькі, Капыльскі раён — 1945), паэт, аўтар лірычных вершаў — **100 г.**

**24** — **Васілеўскі Давыд Веньямінавіч** (1895, Старадарожскі раён — 1976), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў — **130 г.**

**26** — **Янушкевіч Яўстафій** (1805, в. Прусы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Салігорскі раён) — 1874), кнігавыдавец, публіцыст, мемуарыст, адзін з арганізатараў паўстання 1830—1831 гг. на тэрыторыі Беларусі — **220 г.**

Снежань

**6 — Баранаў Мікалай Юльянавіч** (1915, мяст. Пясочна, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер в. Пясочнае, Капыльскі раён) — 1996), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, гаспадарчы дзеяч, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі — **110 г.**

**9 — Таруцін Ігар Германавіч** (1940, г. Стоўбцы), вучоны ў галіне фізікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998) — **85 г.**

**10 — Рушчыц Фердынанд** (1870, Валожынскі раён — 1936), жывапісец, графік, тэатральны дэкаратар і педагог, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы і Літвы — **155 г.**

**10 — Нячаеў Арсен Аляксеевіч** (1910, Капыльскі раён — 1989), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1946), кавалер ордэна Леніна — **115 г.**

**18 — Ходзька Іосіф Іванавіч** (1800, г. п. Крывічы, Мядзельскі раён — 1881), географ, геадэзіст, тапограф, ганаровы член Рускага геаграфічнага таварыства — **225 г.**

**20 — Гурэвіч Сямён Шоламавіч** (1915, г. Ігумен, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер г. Чэрвень) — 1982), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **110 г.**

**20 — Шуцько Іван Цітавіч** (1925, в. Гаць, Крупскі раён — 1984), пісьменнік, аўтар кніг вершаў, казак і апавяданняў для дзяцей, баек і мініяцюр — **100 г.**

**20 — Казей Арыядна Іванаўна** (1925, в. Станькава, Дзяржынскі раён — 2008), удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, педагог, заслужаны настаўнік БССР, Герой Сацыялістычнай працы — **100 г.**

**23 — Ляшчынскі Адам Браніслававіч** (1920, Капыльскі раён — 2006), удзельнік абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), кавалер ордэна Леніна — **105 г.**

**24 ці 25 — Селях-Качанкі Вячаслаў Антонавіч** (1885, г. Лагойск — 1976), спявак, рэжысёр, музычна-грамадскі і тэатральны дзеяч, арганізатар Беларускага студыйнага хору (цяпер Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь), пастаноўшчык першай на беларускай мове оперы “Русалка” А. Даргамыжскага — **140 г.**

**25 — Пастарнацкі Фёдар Ігнатавіч** (1845, Мінскі раён — 1902), вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны, адзін з заснавальнікаў бальнеалогіі і курарталогіі — **180 г.**

**25** — **Саковіч Антон Навумавіч** (1895, Лагойскі раён — 1982), ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, вызвалення Беларусі ў Вялікую айчынную вайну, кавалер ордэна Леніна — **130 г.**

**25** — **Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна** (1900, г. Мінск) — дзяржаўная ўстанова — **125 г.** з часу адкрыцця

**25** — **Слуцкі цукровaрафінадны камбінат** (1965, г. Слуцк), адкрытае акцыянернае таварыства — **60 г.** з часу ўвядзення ў эксплуатацыю

**28** — **Шаціла Іван Браніслававіч** (1910, Пухавіцкі раён — 1977), акцёр, народны артыст Беларусі — **115 г.**